...дам. Вохрыстыя таны карціны звязаны ва ўяўленнях гледачоў з жытнёвымі ...мі, саломай, водарам сена, подыхам цёплага ветрыка, гудзеннем пчолаў, мёдам, натуральнымі прыроднымі матэрыяламі. Белыя адценні вопраткі пісьменніка атаясамляюцца са шчырасцю, прастатой і душэўнай адкрытасцю ...тага чалавека. Як асноўныя колеры карціны, гледачы таксама выдзялялі ...жавы, жоўты, руды колеры. Асноўны выразны і сімвалічны змест усіх ...леных таноў палатна – гэта цеплыня, зямля, дрэва, салодкасць, спакой і раўнавага.

Дадатковы эфект матэрыяльнасці, датыкальнасці, набліжанасці выявы да гледача надаецца тэхнічнымі якасцямі тэмперных фарбаў, якія абраў ...Стальмашонак у якасці матэрыялу твора. Мабыць, гэта прастата і натуральнасць выявы прывялі да таго, што не ўсе беларускія пісьменнікі прызналі ...партрэтам дакладны адбітак тонкай духоўнай натуры народнага паэта.

Згодна ж уяўленняў беларускіх гледачоў, карціна можа не толькі выклікаць ...васць і павагу да знакамітага суайчынніка, але і абуджаць пачуцці патрыятызму, любові да сваёй Радзімы, Беларусі, роднай зямлі, вёскі, будзіць пачуццё адвечнага. “Партрэт народнага паэта Беларусі Якуба Коласа” прымушае людзей задумацца аб чалавечым жыцці, узважана адносіцца да слоў, думак і ...чынкаў, выклікае жаданне асэнсавана і годна пражыць сваё жыццё.

Літаратура:

1. Якуб Колас у творчасці мастакоў / аўт.-склад. Ю. А. Карачун. – Мінск: Беларусь, 1982.
2. Частнова Р. П. Уладзімір Стальмашонак. – Мінск: Беларусь, 1983.

*І. М. Гоўзіч (Мінск, Беларусь)*

## “КАЗКІ ЖЫЦЦЯ” ЯКУБА КОЛАСА І СТЫЛЁВЫЯ ПОШУКІ ЛІТАРАТУРЫ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX СТ.

### (на прыкладзе творчасці прадстаўнікоў «філалагічнага пакалення»)

Якуб Колас – класік беларускага слоўнага мастацтва, з творчымі дасягненнямі якога звязана станаўленне маштабнай нацыянальнай паэзіі і прозы. У вершах, апавяданнях, аповесцях, паэмах і казках пісьменніка скандэнсаваўся і адлюстраваўся менталітэт беларускага народа – руплівага гаспадара, стараннага працаўніка, філосафа і мастака-музыкі, які з годнасцю прайшоў праз шматлікія гістарычныя і сацыяльныя выпрабаванні.

Асабліва неспрыяльнымі для пісьменнікаў былі 30 – 50-я гады міну стагоддзя падчас панавання ў грамадстве і мастацтве, культуры ідэі класа барацьбы. Аднак менавіта ў гэты перыяд нараджаюцца лепшыя філасоф алегарычныя казкі Якуба Коласа: «Цвіркун» – пра незалежнасць сапраўдна мастацтва ад кан`юнктуры, пра сумленнасць і годнасць творцы; «Асінае гнязд пра слабасць, якая, аб'яднаная, можа перамагчы любую сілу; «Гусі» – пра свабо і незалежнасць, пра неабмежаванасць духу («Думалі гусі, што справа іх прапа Але змаганне загартавала іх сілы. Акрэплі іх крыллі і лёгкім стала іх Махнулі крыллямі гусі, срэбраныя пырскі над рэчкай узвіліся, і паляцелі гусі той жаданы, на той недасяжны востраў» [2, с. 308]).

Мастак свядома абраў прытчападобнае, казачна-алегарычнае пісьмо («Калі вы скажаце, што гэта няпраўда, а байка, дык я запытаюся: а дзе тая мяжа, што аддзяляе праўду ад выдумкі? І ці не бывае так, што выдумка ходзіць як праўда, а чыстую праўду лічаць за выдумку?» [2, с. 308]), каб узвысіць чалавечы дух, каб у трагічных абставінах паказаць людзям, што ёсць сапраўдныя каштоўнасці. Падобная алегарычнасць з'яўляецца не толькі спосабам уцёкаў ад рэальнага свету ў свет фантастыкі, а і каталізатарам аналітычнага пазнання яго ў пераламленні вечных ісцін, у праекцыі на будучыню.

Як і казка, прытча – жанр старажытны, эталагічны, павучальны, які грунтуецца на мастацкіх прынцыпах іншасказальнасці, упадабнення, перанясення адных прыкметаў на другія і значнага абагульнення, блізкі прыёмамі пісьма для тых твораў, у якіх не на апошнім плане мараль, дыдактычная выснова, сэнсавая падтэкставасць. У пэўныя перыяды развіцця мастацтва (Асветніцтва, постмадэрнізм) прытчападобнасць становіцца як бы **сродкам выжывання высокага мастацтва**, яго захавання і ад залішняй ідэалагізацыі, і ад рафінаванай спрошчанасці, і ад барочнай прыдворнасці. Прытчападобнасць не толькі канкрэтны мастацкі прыём, але і **ход думкі, спосаб мыслення вобразамі**, якому цесна ў межах нарматыўных, класічных, традыцыйных эстэтычных канонаў. На сучасным этапе – гэта прэрэгатыва як рэалістычнага (В. Быкаў, А. Адамовіч, В. Казько, Я. Сіпакоў), так і мадэрнісцкага мастацтва. Першае наслойвае на праўдзівае незвычайнасць, загадкавасць, сімвалічную ўмоўнасць, другое перасатварае жыццё ва ўмоўную метафару, у іншасказ, надае відавочную перавагу вымыслу, разбурае стройны ланцуг праўдападобнасці, дэтэрмінаваную сувязь з'яў, лагічную стройнасць і сэнсавую ўпарадкаванасць падзей і ўчынкаў, што складаюць у большай ці меншай ступені аснову мастацкай творчасці.

Як часта бывае ў нашай нацыянальнай літаратуры, на мяжы рэалізму і мадэрнізму шукаюць сябе многія аўтары, і сярод іх – Янка Сіпакоў, паэт і празаік, прытчападобнасць творчасці якога становіцца для яго магутным сродкам пазнання **гармоніі алагічнага ў малым часе жыцця**, дадатковага пазнання яго карнавальнай сутнасці.

Прытчападобнымі з'яўляюцца многія творы Янкі Сіпакова – як паэтычныя, так і празаічныя. «Скарга прыручанага ваўка» – прытча пра страчаную свабоду, пра жыццё на волі, якое немагчымае ў канкрэтных умовах, калі ці не самы вальналюбны звер апынуўся ў звярынцы ў клетцы і – што яшчэ больш жахліва – пастаўлены насупраць зайца, што выскаляецца з вечнага ворага свайго, нявольніка. «Вяртанне ў лес» – ці не менш знакаміты твор пра прыручанага і навучанага людзьмі мядзведзя, якому пры наведванні іх свабодныя суродзічы адмаўляюць у прызнанні, які, нарэшце, гіне ад стрэла вартаўніка статку, чалавека. Гіне ад людзей, іншапляменцаў, якія яго скалечылі, перайначылі на свой лад,ператварылі ў марыянетку, сляпога выканаўцу іх загадаў, у **нішто**, у **недарэку** і **рызака** ў вачах тых, ад каго ён адарваўся, на якіх забыўся на час. Прытчападобныя і творы паэта, якія ўвайшлі ў кнігу «Веча славянскіх балад», – пра духоўную смерць людзей, якія здраджваюць сваім караням, традыцыям, забываюцца на сваё імя, на свой народ. Кніга ў цэлым – пра адзінства як гарантыю перамогі, смеласць як выклік ворагам, што можа прывесці да перамогі, супольнасць як форму выжывання ў экстрэмальных умовах. У ёй апавяданне эпічнае яднаецца з глыбокім аналізам духоўнага свету нацый, з раскрыццём нацыянальных характараў, нацыянальнай ментальнасці, а канкрэтныя сюжэты і факты «перарастаюць» сябе, ператвараюцца ў алегорыі, робяцца своеасаблівымі кропкамі адліку агульначалавечых ісцін. На падзею, такім чынам, нарошчваецца дадатковы патэнцыял філасофскага зместу.

Асабліва выразна талент іншасказальнага, метафарычна-прытчавага пісьма выявіўся у празаічных творах пісьменніка – «Пажар», «Клетка», «Яма», «Гармонік», «Зона», «Слабыя і моцныя», «Лета з мянушкай», «Тыя, што ідуць» і іншых. Яны склалі аснову другога тома твораў пісьменніка 1997 года выдання. У іх не толькі выразна «спрацоўвае» прытчападобнасць як мастацкі прыём, але і самі яны становяцца разгорнутымі прытчамі і метафарамі. Аўтар даў ім менавіта такое жанравае вызначэнне, вылучыў у кнізе іх у асобны, цэнтральны раздзел. Што кідаецца ў вочы пры чытанні выдатных твораў, дык гэта арыентацыя мастака на перастварэнне «жывой рэальнасці» ў не менш жывы ўяўна-віртуальны свет. Звычайны, жыццепадобны сюжэт ператвараецца ў міф, у філасофскае разважанне,

фантазійныя мроі. Героі і дзеі вольна пераводзяцца з праўдападобнага све... фантазійны (як у «Клетцы» )... Пакараны, перайначаны з чалавека ў велізарную птушку, – Сінявок, узлятае ў нябёсы з сваёй «турэмнай камерай» ... аказваецца не прызнаны Каханай і Сынам; ні то селянін Бусел, ні то птушка бусел, што назірае, як гінуць і хлявы, і хата; ні то людзі, ні то мятлушкі Я... Мятлушка, якія могуць пераўтварыцца ў бесклапотных істотаў і горка сумаваць ад неўладкаванасці зямнога жыцця – вось незвычайныя героі пісьменніка. Свет распаўся ў творах мастака на рэальны і нерэальны, героі – таксама. П... адбываюцца і ў храналагічна абмежаваным часе, і ў вечнасці. Як, напрыклад... шматзначным, метафарычным творы «Тыя, што ідуць». ... Выпадкова дач... звычайны чалавек, сустракаецца з людзьмі-прывідамі, што ідуць неяк незвычайна... «быццам плылі ў вадзе ці, наадварот, рухаліся ў беспаветранай прасторы». Сляпыя, нямыя, яны нават ноччу мала адпачываюць: будуюць хаты, аруць поле, сеюць жыта і пры першых сонечных промнях ідуць у паход усё далей і далей... вядомыя Белабогам і Прыгажуняй. Патрапіў у нерэальны свет, але досыць гарманічны, адзначаны гуманістычнымі дзеямі, далучыўся да яго, стаў у ім рэшце рэшт прызнаным, каханым Прыгажуняй і ўжо фігуруе пад імем Незнаёмы. Ен таксама будуе дамы, таксама не спіць па начах, як і яго новыя сябры, творыць дабро на зямлі. І, вярнуўшыся ў свет рэальны, парабіўшы работу на ўчастку, ён ператвараецца ўжо ў Падарожніка, далучаецца да тых, што ідуць. Такая фабула фантазійнага твора. Твора метафарычнага. Твора-прытчы пра рух наперад як збаўленне ад змізарнення і смерці. У агульным плане ці не разгорнутая гэта метафара нашага застойнага і падчас невыносна-змрочнага, бязрадаснага жыцця – таго жыцця, якое, магчыма, не мае сэнсу? Ці не прытча гэта пра народ, які яшчэ да гэтай пары шукае свайго прытулку на зямлі, у сваім краю жыве, як у летаргічным сне? Што ці хто абудзіць гэты народ ад сну? Можа, не выпадкова звычайны чалавек, але відушчы, пакідае жыццё рэальнае, населенае такімі ж, як і ён, і ўступае ў жыццё прывіднае, ідзе, каб ратаваць і весці за сабой невідушчы народ? Фінал апавядання-прытчы, разгорнутай метафары абнадзейвае не толькі Падарожніка – апантанага прагай дабра, але і чытачоў у тым, што яшчэ магчыма дасягненне Праўды: «Там быў разумны Белабог. Там была Прыгажуня. Там, хутчэй за ўсё, рос ужо і яго сын – можа, вось зараз ён ідзе поплеч з вадаром. І яшчэ ён міжволі адчувае, што там неўзабаве яму давераць нешта важнае і сур'ёзнае – магчыма, нават у бліжэйшую сяўбу яго зробяць Галоўным Сейбітам. Зараз Падарожніку здавалася, што ён абраны, нават асуджаны кімсьці на гэты рух

і на гэтую вандроўку. Усё, о Божа, як ты і кажаш, вяртаецца на кругі свая» [3, с. 339].

Яшчэ адзін з прадстаўнікоў «філалагічнага пакалення» – Анатоль Вярцінскі – паэт, які ўжо з самага пачатку сваёй творчасці настроіўся на ...ктызм, што прывяло да заканамернага пашырэння ў яго паэзіі жанру прытчы, ...якая стала абалонкай індывідуальнага стылю мастака.

Адбылося так, што ў творчасці Вярцінскага пераважыў інтэлектуальны пачатак над пачуццёвым, а апасродкаваная праекцыя на жыццёвы вопыт чалавецтва павялічыла выхавальныя магчымасці яго лірыкі. Дарэчы, аўтарскае вызначэнне прыналежнасці да жанру прытчы атрымалі толькі тры яго творы – «Дурман», «Арол галодны і сыты», «Мы, мёд і пчала». Астатнія ж вершы даследчыкі лічаць прытчамі па фармальна-змястоўных прыкметах. Яшчэ ў першых сваіх вершах паэт пачаў распавядаць прытчу пра блуднага сына – усё чалавецтва. Вытокі падобнай прытчавасці знаходзяцца ў міфе, міфа-паэтычным мысленні, непасрэдна звязаным з травесціяй пры адным выключэнні: у А. Вярцінскага страчана «першабытная» паэтычная фігуральнасць і мастацка-метафарычная вобразнасць, аднак эмацыянальнасць набывае дынамічнае ўвасабленне іншымі – рытміка-інтанацыйнымі – сродкамі.

У сваіх прытчах («Косім траву – яна не крычыць...», «Ноччу заплакала дзіця», «Вы зразумейце правільна...» і інш.) паэт працягнуў традыцыі К. Тураўскага, З. Бядулі, Ядвігіна Ш., Якуба Коласа, выйшаў на максімальнае абагульненне, звярнуўся не толькі да індывідуальнага чытача-рэцыпіента, але і да чытача грамадскага, агульнага, масавага, таму яны – іншарэальнасць, што з'яўляецца універсумам. Стаўшы адной з дамінантных стылявых рыс, прытчавасць мастака афармляецца не толькі ў прытчы-маналогі, але і найперш у вершы-разважанні з элементамі дыялогу. Бывае, што дыялогавы пачатак выходзіць на першы план, канчаткова выцясняе аўтарскія медытацыі, як у «Адлучэнні Талстога ад царквы», а здараецца, уваходзіць у твор асобнымі астраўкамі («Каментарый да Карана»). Такім спосабам падачы матэрыялу характарызуюцца вершы з элементамі прытчавасці, заснаваныя на непасрэдным звароце да ўяўнага чытача-рэцыпіента («Парада юным закаханым», «Няма дурных» і інш.). Маштабная задума – абагуліць вопыт паводзінаў чалавецтва на працягу многіх стагоддзяў – рэалізуецца ў таленавітага майстра слова ў змешаных жанравых ліра-эпічных і ліра-эпіка-драматургічных прытчах і прытчаформах.

Творы Янкі Сіпакова, Анатоля Вярцінскага, як і казкі Якуба Коласа, становяцца сімвалічнымі алегорыямі, у якіх побач з праўдай квітнее вымысел,

малы час мяжуецца з часам вялікім, героі пераўтвараюцца ў сімвалы, набываюць адзнакі агульнасці. Пра метамарфозы рэальнага жыцця, пра яго сучасныя балючыя праблемы пісалі такія розныя аўтары, зацікаўленыя, як і бывае заўсёды ў прытчах і казках, у выпраўленні нораваў, у павучэнні – праз рэальны і нерэальны малюнак, рэальныя і надрэальныя падзеі, праз глыбокае філасофскае мысленне.

Літаратура:
1. Вярцінскі А. Ветрана. Кніга паэзіі. – Мінск, 1979.
2. Колас Я. На прасторах жыцця.: Аповесць, апавяданні, казкі. – Мінск, 1986.
3. Сіпакоў Янка. Выбраныя творы ў двух тамах. Т. 2. Проза. – Мінск, 1997.

*З. У. Драздова (Мінск, Беларусь)*

## ЭТЫКА КАХАННЯ, СЯМ'І І ШЛЮБУ Ў ТРЫЛОГІІ ЯКУБА КОЛАСА "НА РОСТАНЯХ"

Класічная мастацкая літаратура заўсёды адрознівалася вялікай цікавасцю да праблем кахання, сям'і і шлюбу, імкнучыся намаляваць ідэальнага сямейнага чалавека, паказаць сям'ю як школу любові і чалавечнасці. У непадфарбаваным выглядзе паказвала яна і безлюбоўныя сямейныя саюзы, якія нярэдка заканчваліся здрадаю, разбурэннем сям'і. І ў тым і ў другім выпадку класічны твор утрымліваў у сабе заклік да захавання "шлюбу сумленнага, ложа бязгрэшнага" (апостал Павел), а грэх пралюбадзеяння расцэньваўся як злачынства супраць маральнасці. Праўда, выразна чуліся ў гэтым закліку і ноткі шкадавання тым, хто вымушаны быў несці цяжкі крыж асвечанага царквой, але не заснаванага на каханні шлюбу.

У вялікім творы, якім з'яўляецца коласаўская трылогія "На ростанях", сямейны чалавек не паўстае буйным планам, ён трапляе ў поле зроку толькі настолькі, наколькі з ім сутыкаецца малады нежанаты настаўнік Лабановіч, аднак след ад такога сутыкнення застаецца ў душы героя надоўга. Са шматлікіх сем'яў, якія даводзіцца бачыць Лабановічу на сваім шляху, толькі адна пакідае ўражанне шчаслівай. Гэта сям'я обер-кандуктара Эдуарда Рымашэўскага з яго старанною жонкаю і двума сынамі, якіх Лабановіч падвучвае да паступлення ў гімназію. Атмасферу дамавітасці, цеплыні і ўтульнасці стварае ў ёй жонка Мальвіна Казіміраўна, якую Колас сцісла характарызуе як "адданую маці для дзяцей, добрую жонку для мужа і дбалую гаспадыню ў доме" [2, с. 651]. Лабановіч пачувае сябе ў гэтай сям'і як рыба ў вадзе. Яго радуюць і старанныя, паслухмяныя, уважлівыя вучні Юзаф і Эдзік, і гасцінная Мальвіна Казіміраўна,